ПРАЛЕТАРЫЯ УСЯХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

ГОД ВЫДАННЯ—XV
№ 34 (4286)
Серада, 10 лютага 1932 г.
МЕНСК, Свярдлова 33

ПЕРАДАВАЯ: — Узьняць тэмпы жывёлазагатовак.

6 ДЗЕНЬ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ. — Сваячасовае складаньне фуражных фондаў і ліквідацыя абязьлічкі забясьпечылі нармальную зімоўку і падрыхтоўку конскага парку да вясны ў калгасах «Кастрычнік», «Новае Лядцо» і «Авангарда». (1 стар.).

Вышэй хвалю сустрэчных плянаў па загатоўках і вывазцы лесу! 1 ст.).

Бальшавіцкі адпор дэмабілізацыйным апартуністычным настроям (1 стар.).

17 КАНФЭРЭНЦЫЯ УсеКП(б).—Даклад т. В. В. Куйбышава аб другой пяцігодцы. (2 і 3 стар.).

Генэральны штурм Усуна (4 стар.).

Максымум рэвалюцыйнай непрымірымасьці ў барацьбе з агентамі нападбітага яшчэ клясавага ворага (з дакладу т. РУДЗУТАКА на IV пляніуме ЦКК УсеКП(б) (4 стар.).

УЗЬНЯЦЬ ТЭМПЫ ЖЫВЁЛАЗАГАТОВАК

БССР зьяўляецца адным з важнейшых жывёлазагатоўчых раёнаў Саюзу. Толькі за адзін першы квартал жа павінна адаць 23.333 тоны мяса (жывой вагі). 45 проц. квартальнага пляну павінна было быць выканана да 1 лютага.

Неабходнасьць фарсаванага выкананьня пляну вынікае з росту гарадоў і са зьяўленьня новых прамысловых цэнтраў, з няўхільнага нарастаньня попыту на вэтыпной адольнасьці і попыту рабочых мас на асноўныя прадукты харчаваньня.

Як-жа выконваецца плян загатовак жывёлы па БССР? Тэмпы здачы мясапрадукцыі тоўба прызнаць зусім недавальняючымі. Чацьверты квартал 1931 году паў дрэнныя вынікі — 68 проц. заданьня; у студзені і лютым гэтага году становішча ня толькі не палепшылася, а нават пагоршылася. На 6 лютага квартальны плян рэалізавана на 14,6 проц. Ёсьць раёны, дзе мяса здана толькі 4-5 проц. пляну (Чэрыкаў, Бялынічы, Прапойск, Бярозіна).

Адной з асноўных крыніц сырцу для загатовак паміны зьяўляецца сьвінагадоўчыя калгасныя фермы; між тым, квартальны плян загатовак па СТКФ выкананы толькі на 1,3 проц. Большасьць райкалгасаюзаў нічога не зрабілі, каб мабілізаваць вакол загатовак шырокія масы калгасьнікаў. Загатоўкі па СТКФ ня ўвязаны з асноўнымі мерапрыемствамі па арганізацыі сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Адсюды ход загатовак знаходзіць сваё тлумачэньне па асобных раёнах і ў тым, што падрыхтоўчая работа — цэлы рад арганізацыйных мерапрыемстваў — правядзіцца з недапушчальным спазьненьнем. Хіба маглі Лепельскі і Горацкі раёны своячасова выканаць плян, калі арганізацыі «Жыгрыліся» толькі ў першай палове ступеня давесьці кантрольныя лічбы да сельсаветаў? Як могуць Чачэрскі і Навускі раёны з посьпехам загатоўляць жывёлу, калі мясцовыя арганізацыі дагэтуль не паклапаціліся давесьці пляны загатовак па калгасных сельсаветаў, населяцтву?

Позьні спуск пляну, зусім слабае разгортваньне масавай работы вакол загатовак, падмена гэтай работы сэмтам адміністраваньнем, адсутнасьць у большасьці раёнаў жывёлазагатовак з іншымі гаспадарка-палітычнымі заданьнямі і зусім слабы ваўнск на кулака — вось асноўныя прычыны гашебных тэмпаў загатовак жывёлы.

Кулацтва шалёна агітуе за забой жывёлы, само драпежніцкі зьнішчае яе і спэкулюе мясам на прыватным рынку. Прыміраючыя адносіны да кулацкага сабатажу прывялі да таго, што ў Парыцкім, Прапойскім, Рэчыцкім, Старадорожскім раёнах з 1 кастрычніка 1931 году па 1 лютага 1932 году кулацка-заможныя гаспадаркі не здалі ніводнага кілё мяса.

У радзе раёнаў даюць сабе адчуваць месьцішка-спажывецкія настроі. Старобінскія арганізацыі сарвалі плян здачы жывёлы, дапусьцілі закупку і разбазарваньне жывёлы сельскагаўтаварыствам. У Чырвонаслабодзкім раёне дапушчаны загатоўкі жывёлы за кошт плянавых заданьняў для патрэб мясцовых раённых і саўгасных сталовак. У саўгасах «Пасовічы», «Некрашэвічы» і «Ялава» ў канцы мінулага году забіты сотні сьвіней, мяса якіх разбазарана на месцы. Гэтыя рэакцыйна-спажывецкія тэндэнцыі не спаткалі на месцы рашучага адпору.

У мэтах палепшэньня работы і рэзкага павышэньня тэмпаў загатовак неабходна, па-першае, перабудаваць работу загатоўчага апарату, узмацніць аператыўнае кіраўніцтва гэтай кампаніяй з боку раённых арганізацый і бальшэвізаваць яе як па правапартыўнічай практыцы, настроях самацёку, так і «ліваўшіх» сельбах. Пераліка дапусьціць нават самага малога недавыкананьня пляну загатовак жывёлы.

У сувязі з задачамі разгортваньня сацыялістычнай жывёлагадоўлі ў загатоўчай рабоце на перыяд пляна высоўваюцца пытаньні правільных суадносін паміж пасобнымі відамі адной жывёлы. Аднак, гэтыя адносіны зараз груба парушаюцца. Дэфэктыва аб скарачэньні ўдзельнай вагі буйной рогатай жывёлы за лік павялічэньня колькасьці зданых сьвіней ня выконваецца. Да 6 лютага здана рогатай жывёлы 21,4 проц., а сьвіней—толькі 5,7 проц. Гэта ў асноўным вынік таго, што загатоўчыя арганізацыі ўсё яшчэ ідуць па лініі найменшага супраціўленьня, ігнаруючы галоўныя патрабаваньні кампаніі. Ясна таксама, што ў радзе месц няма дзейнай барацьбы за якаснае выкананьне пляну.

Важнейшай умовай устанаўленьня правільных суадносін паміж пасобнымі відамі зданой прадукцыі, павялічэньня ўдзельнай вагі сьвіней зьяўляецца максымальны ахоп кантрактацыяй калгасаў і бядняцка-серадняцкіх адноасобных гаспадарак. Толькі гэтым шляхам можна ўстанавіць неаслабны кантроль за ажыцьцяўленьнем загатовак. Незадавальняючая кантрактацыя прывяла ў радзе раёнаў да парушэньня ўсіх тэрмінаў здачы прадукцыі.

Паводле пярэктыў, у 1932 годзе павінна быць ахоплена кантрактацыяй дзьве трэці галавога пляну жывёлазагатовак. На сёньняшні дзень па сыстэме Белзагатжывёлы закантрактавана 31,4 проц. заданьня па буйной жывёле і 13,6 проц. па сьвіньнях.

У калгасах закантрактавана буйной рогатай жывёлы каля 600 штук. сьвіней — каля 7 тыс. штук; гэта ў 3-4 час. ад узельнай вагі сацыялістычнага сэктару ў загатоўках складае звыш 50 проц.

Важнейшай умовай далейшага нарастаньня тэмпаў і пасьпяховай барацьбы з абязьлічкай у загатоўках зьяўляецца шырокае правядзеньне кантрактацыі і скарачэньне яе ў найкарацейшы тэрмін. Загатоўчыя арганізацыі павінны поўнасьцю аўладаць гэтым вагаром, бо імянна ён, галоўным чынам, павінен забясьпечыць плянавае, бесьперабойнае паступленьне мяса-сьрцу.

На райкалгасаюзы, фермы ўскладаецца абавязак — поўнасьцю і ў тэрмін выканаць свае абавязкі па здачы таварнай прадукцыі. Рэалізацыя заключаных дагавораў павінна быць самым пільным чынам увязана з мерапрыемствамі па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

У цэнтры ўвагі павінны стаяць задачы палепшэньня якасьці зданой прадукцыі. Трэба дабіцца прыёму добраякаснай жывёлы. Для гэтага ў раёнах, што знаходзяцца далёка ад чыгункі, неабходна арганізаваць перавалачныя базы. Пераліка далей дапускаць такіх выпадкаў, калі жывёла па дарозе траціла да 14 проц. жывой вагі, а гэта мела месца ў Глускім і іншых раёнах.

Вопыт перадавых раёнаў, як Уваравіцкі і інш., яго калгасы здалі яшчэ да 15 студзеня 41 проц. квартальнага пляну, дае мясазагатоўкі арганізаваны, трэба пашырыць на ўсе раёны.

XVII усесаюзная партканфэрэнцыя вызначыла цэлы рад задач далейшага паўсюднага палепшэньня снабжэньня працоўных. У 1932 годзе будуецца 57 новых магутных мясакомбінатаў. Гэтыя прадпрыемствы, як і ўжо існуючыя, павінны быць поўнасьцю забясьпечаны сырцом.

Задача вожнай партыйнай арганізацыі, кожнай ячэйкі — узмацніць барацьбу за разгортваньне сацыялістычнай жывёлагадоўлі, за мяса, пабальшэвіцку пабудаваць поўнага выкананьня пляну жывёлазагатовак.

ВУГОЛЬНЫЯ БАГАЦЬЦІ СССР

Здабыча вугалю ў Саюзе, якая ўжо падвоілася ў параўнаньні з даваеннай, павінна да канца наступнага пяцігодзьдзя павялічыцца яшчэ ў некалькі раз і дасягнуць 280-300 млн. тон.

Што-ж мы ў Саюзе маем для задаваленьня далейшага разьвіцьця здабычы вугалю, якія нашы вугольныя рэсурсы, як яны разьмешчаны па тэрыторыі Саюзу, якою якасьцю ўладае наш вугаль, што мы аб ім ведаем?

Выяўляецца надзвычай вялікае наша багацьце вугалем, які дасягае ў больш або менш абсьледаваных базэйных і раёнах звыш 600 млрд. тон, пры чым у гэтую лічбу наўзыходзяць вельмі мала пакуль што дасьледаваныя новыя вельмі буйныя вугляносныя плошчы Тунгускага, Ленскага (Якуція), Пячорскага краю і Паўночна-Ўсходняй акраіны Азіяцкай часьці Саюзу.

Калі мы больш абсьледуем гэтыя тэрыторыі, напэўна ў нас будуць пад ставы, прынамсі, падвоіць цяперашнюю лічбу запасаў, што паставіць нас па запасах вугалю на другое месца ў сьвеце. Зараз на першым месцы стаяць Паўночна-Амэрыканская Злучаныя Штаты, якія ўладаюць 3,7 трыльёнамі тон, далей ідзе Канада з запасам 1,2 трыл. тон.

У прыватнасьці, за апошнія два гады ў нас выяўлены новыя вельмі буйныя ресурсы ў некалькі дзесяткаў млрд. тон. Значна павялічаны запасы Караганды ў Казахстане, афарбаваны, мала вядомыя за гэтага часу, дзьве буйныя вугляносныя тэрыторыі ў Сібіры-КансКім і Чулыма-Енсейскім раёнах, адбыўся значны прырост запасаў бурага вугалю на Ўсходнім схіле Ураду (Чэлябінскі раён) і каменнага на Заходнім яго схіле (Кізелаўскі раён). У Сярэдняй Азіі выяўлены зусім новыя, вельмі буйныя месцанараджэньні вугалю, каля 1,5 млрд. тон на Ўсходнім Казахстане, якія паўнальна недалёка знаходзяцца ад Алтайскіх рудных раёнаў.

Устаноўлены буйныя запасы украінскага бурага вугалю, выяўлены новыя вугляносныя вучасткі ў Пячорскім краі, шляхам сьвідравальных работ і метадаў геафізычнага здымку выяўлена падземнае працягненьне Данбасу на Паўднёвы Ўсход да Доту, у раёне Радорскай — Калягіна, прычым гэты зусім новы вучастак Данбасу, пакрыты ад паверхні чахлом бязвугальных, больш маладых асадкаў, займае паводле арыентовачнага падліку плошчу каля 500 кв. клм. Зусім магчыма, што ў далейшым ён будзе яшчэ больш шырокім разьведкамі, працягнут за Дон у бок Волгі і што, апрача таго, будуць знойдзены падобныя-ж новыя плошчы на акраінах Данбасу.

6-ты дзень генэральнай праверкі

Сваячасовае складаньне фуражных фондаў і ліквідацыя абязьлічкі забясьпечылі нармальную зімоўку і падрыхтоўку конскага парку да вясны ў калгасах „Кастрычнік", „Новае Лядцо" і „Авангард"

За захаваньне фуражнага фонду адказвае старшы конюх

ЧЭРВЕНЬ, 7. Калгас «Кастрычнік», Градзянскага сельсавету, разгарнуў падрыхтоўку да трэцяй бальшавіцкай сяўбы.

Насенны і страхавы фонды на яравы плян (плошча звыш 500 гэктараў) ачышчаны і осушаны за выключэньнем пашаніцы, ачыстка якое на зроблена.

Нагрузка на рабочага каня ў часе сяўбы дасягае каля 10 га. Каб выйсьці пераможным у сяўбе, калгас зьвярнуў на пятавую сілу асаблівую ўвагу. Абязьлічка ў догляде і скарыстаньні коняй зьніччана. 48 рабочых коняй і 14 штук малатлянка даглядаюць 4 конюхі і старшы конюх. Да кожнага конюха прымацаваны поўныя коні. Коні разьбіты на групах: лепшыя для нижніх робот стаць у адной стайні, для лёгкіх — у другой і с. д. Устаноўлены нормы кармленьня.

На час пасеўнай кампаніі створаны брацігадзі фуражныя фонды ў колькасьці 76 цэнтнераў канюшыны, 85 цэнтн. сена, 56 цэнтн. аўса з разліку 9 кгр. сена-канюшыны і 2½ кгр. аўса на рабочага каня на дзень. Фуражны фонд захоўваецца старшым конюхам, ён-жа член праўленьня. У стайні вывешаны правілы ўнутранага распарадку.

Калгас загадзя пачаў вывазку гною з мэтай скарачэньня тэрміну палявых робот у часе пасеўнай кампаніі. Брыгада калгасьнікаў з 12-ці чалавек і 8 коняй ужо вывезла 225 вазоў гною.

Пачаўся рамонт інвэнтару: плугоў, калёс і інш. Адкамандавана 7 калёс, 25 плугоў. Вялікай перашкодай у рамонце калёс зьяўляецца недахват цьвікоў.

Адным з недахопаў брыгада лічыць тое, што плян весьняной сяўбы яшчэ не абмяркоўвае на сходзе калгасьнікаў. Таксама ў калгасе не хапае ня вызначэньня плошчы насеньня вікі і ільну. Для таго, каб гэта не зьявілася ўдарам па пасеўнай, трэба райкалгасаюзу вывяць лішкі гэтага насеньня ў другіх калгасах і наладзіць паміж калгасамі абмен.

Брыгада: Якавін Р. Л., Нябоpскі Н. С., Сямашка А., Харытончык.

Пад наглядам т. Сіротка

за ўвесь час ня было выпадку захворваньня коняй

ПУХАВІЧЫ (Наш кар.).

З кожным годам на нашых калгасных і саўгасных палёх павялічваецца колькасьць складаных с.-г. машын, якія замяняюць конскую цягавую сілу. Але было-б шкодным думаць, што ўжо зарэз конь, як цягавая сіла, становіцца непатрэбным. Паколькі правільна буйзе арганізован догляд і скарыстаньне конскай цягавай сілы, будзе залежыць посьпех бальшавіцкай сяўбы. У гэтых адносінах заслугоўвае ўвагі калгас «Новае Лядцо», Пухавіцкага раёну.

У калгасе ёсьць 72 рабочых коні і 3 вытворчыя. Усё конскае пагалоўе знаходзіцца ў 10 добра абсталяваных і зацепленых хлявох. Для догляду коняй выдзелена спэцыяльная брыгада з 5 чалавек. Кожны конюх даглядае 15 коняй. Кармленьне адбываецца ў поўна-вызначаныя гадзіны. Рацыён складаецца з сена і аўса, прычым колькасьнае яго розьмеркаваньне неадпаўзкава ў адносінах да розных груп коняй: «вытворнікам і тым коням, якія знаходзяцца непасрэдна на працы, мы даем крыху больш аўса»,— тлумачыць загадчык гаспадаркі тав. Жайнерчык. Апроча таго, для падрымання працаздольнасьці коняй у часе весьняной сяўбы калгасам выдзелены спэцыяльны фонд у 2.000 пудоў канюшыны.

Догляд коняй добра арганізован. За ўвесь час ня было выпадкаў недакармліваньня, або захворваньня коняй. Апошнія ўпітаны і добра выглядаюць.

Пямала намагаўняў па арганізацыі догляду жывёлы патрацілі старэйшы даглядальнік тав. Сіротка, які працуе ў стайні з дня арганізацыі калгасу. Замест вызначаных, паводле нормы, 15 коняй, Сіротка даглядае 16. Яго коні выдзяляюць значна лепш за астатніх. За ім—конюх Верамейчык і іншыя.

Абязьлічка ў адносінах да скарыстаньня рабочых коняй у калгасе ліквідавана. Кожны конь прымацаваны да пазаобнага калгасьніка, які адказвае за яго стаўленьне ў часе работы.

Калгас «Новае Лядцо» можа служыць прыкладам для астатніх калгасаў, як проба захоўваць і скарыстоўваць конскую цягавую сілу.

З.

Мовай клясавага ворага

КОПЫЛЬ. (Наш кар.). Праўленьне калгасу імя Будзённага, Крывасёлкаўскага сельсавету, зусім не клапоціцца аб падрыхтоўцы каня да вясны. Коні стаяць па калені ў гразі, подсьцілкі амаль ніколі не мяняецца. Большасьць коняй не падкавана. З прычыны дрэннага догляду, коні пачалі хварэць.

Па заўвазе калгасьнікаў аб неабходнасьці ліквідацыі абязьлічкі ў доглядзе коняй і падрыхтоўцы да вясны цягавай сілы, старшыня праўленьня адказвае: «Чорт ня возьме, будуць жывы».

Так можа заяўляць толькі клясавы вораг, які імкнецца сарваць падрыхтоўку да трэцяй бальшавіцкай вясны. Райкалгасаюз павінен праверыць, хто зьяўляецца старшынёй калгасу імя Будзённага.

Я.

***

БЫХАЎ. Рад калгасаў Быхаўскага раёну ігнаруе пастанову ўраду пра захаваньне конскай цягавай сілы. У калгасе «Ленінскі шлях», Іскаўскага сельсавету, у даглядзе коняй панае самая злосная абязьлічка. Коні цэлымі суткамі застаюцца няпоенымі і некормленымі. У калгасе «Чырвоная Вяльма» 8 зусім працаздольных коняй прыкончылі на зобою.

Над лёзунгам «Пя трымаць барахла, ўсё зробіць трактар» кулакі і іх агенты вядуць шалёную агітацыю за зьнішчэньне коняй. Гэта шкодніцкая агітацыя не сустракае адпору з боку раённых арганізацый.

Райкалгасаюз не мабілізаваў увагу калгасных мас на захаваньне цягавай сілы, за падрыхтоўку да вясны, за ліквідацыю абязьлічкі ў доглядзе коняй (БЕЛТА).

Неабходна арганізаваць паказальны поацэс

ТАЛАЧЫН. У Кручанскім сельсавеце спажывецкае таварыства зьяўляецца галоўным віноватым у зьнішчэньні конскай цягавай сілы. Старшыня сельспажыўтаварыства Гурэвіч скупляе маладых коняй па 4-6 галоў і забівае іх, скарыстоўваючы мяса для адкорму сьвіней. Такія-ж факты забою малі месца ў калгасах «Першае мая», «Зьвязда» і «Перамога».

Сельсавет і камсамольская ячэйка, якія ведаюць пра гэта, зусім не рэагуюць на парушэньне пастановы ўраду аб захаваньні конскай цягавай сілы.

Мы патрабуем безадкладнай арганізацыі паказальнага судовага працэсу над віноватымі ў разбазарваньні і забоі коняй.

Фуражны фонд створан яшчэ ў час уборкі

ЛЕЗНА. У калгасе «Авангард», Кальшанскага сельсавету, ёсьць 25 рабочых коняй. Яны разьмешчаны ў двох хлявох: у адным — 8, у другім — 16. Адзін конь, пастаянна прымацаваны да скотнікаў, іх даглядаецца і стаіць асобна.

24-х коняй даглядаюць пастаянна прымацаваныя два малодшыя конюхі Балаеў Лявон і Конікаў Ларыён і адзін старшы — Бондар Ягор. Абязьлічка зьніччана. Кожны конь мае сваю клічку і нумар, а таксама асобны станок, які не мяняецца. Поўны камплект збруі (хамут, лейцы, пасяцёлак, перасяцельнік, дуга) таксама пад нумарам свайго каня вісіць на сьцяне на сваім нумараваным калочку ў пёльным памяшканьні. Гэта вельмі важна, бо, каб ня псаваць каня, збрую трэба прасушваць.

Корміцца коні па нормі і ў строга вызначаны час. Спэцыяльна для конюхаў купілі гадзіньнік. Раніцою, а 5 гадзіне, коні поюцца, а 6 гадзіне пастаўляцца корм; у другі раз — у 12 гадзіне, вечарам зноў поюцца а 6 гадз. і кормяцца нанач а 6 гадзіне.

Работа конюхаў перавядзена на зацікаўленьне. Коні калгасу «Авангард» па гуляюць Дагавор, заключаны з леспрамгасам на вывазку 180 кубаметраў дроў, выканан. Апрача таго, калгас пастаянна займаецца дапатачкай тавараў для сельсаўтаварыства і адпоўніць лён з базы райкаапвёсаюзу.

Ня гледзячы на гэта, коні калгасу ўпітаны, зусім працаздольныя.

На час весьняной сяўбы калгас стварыў фонд кармовага аўса з разліку 2 кгр. у дзень на працяку шэсьці месяцаў (каля 3-х тон) і тры пуды сенажнай якасьці, каля 272 цэнт. Характэрна, што гэты непатрэбны фонд сена, як называюць калгасьнікі «чаю», калгас выкінуў для весьняной сяўбы яшчэ ў часе яго ўборкі з сенажаці.

А. Мікуцкі.



Трактарны парк рыхтуецца да вясны.

Вышэй хвалю сустрэчных плянаў па загатоўках і вывазцы лесу!

Кузеліцкі і Любаньскі сельсаветы прынялі заклік калгасу „Ясная раніца"

На загатоўках у Глускім раёне

Максымальна скарыстаць санны шлях

Квартальны плян па загатоўцы будаўнічых матар'ялаў па БССР за студзень выкананы на 35,9 проц., па дровах—на 34,3 проц.

Калі з выкананьнем пляну загатовак мы маем больш менш здавальняючае становішча, дык недастучальна слаба ідзе вывазка. На 1-га лютага квартальнае заданьне па вывазцы строю выканана толькі на 13,7 проц., дроў—на 19,5 проц.

Пагрозна ў вясьце па вывазцы такія буйныя лесграмгасы, як Асіповіцкі, які вывез 9,5 квартальнага пляну па дровавой драўніне і 16,7—па дровах. Глускі лесграмгас вывез дровавой драўніны 13,1 проц., дроў — 11,3 проц. Рэчыцкі адпаведна — 12,9 проц. і 19,9 проц.

Чым тлумачыцца такое гапебнае адставаньне з вывазкай? Перш за ўсё адсутнасьцю гібкага і аператыўнага кіраўніцтва з боку раду лесграмгасаў лесапавяжкай, навыстарчальнай увагай да арганізаванага набору вожчыкаў.

Зараз з устаўленьнем санных дарог раённыя арганізацыі павінны адвесьці максымум увагі пытаньню лесавывазкі. Дырэктыва Калгасцэнтру аб арганізацыі пастаўных абозаў у кожным калгасе павінна быць неадкладна выканана ўсімі райкалгасаюзамі.

Множацца рады ўдарнікаў лесу

БАБРУЙСК. (ПА ТЭЛЕФОНУ).

АДКРЫТЫ ЛІСТ КАЛГАСУ «ЯСНАЯ РАНІЦА» ЗНАЙШОЎ ЖЫВЫ ВОДГУК У БАБРУЙСКІЧЫНЕ. ПЛЕНУМ ЛЮБАНЬСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, АБ ГАВАРЫЎШЫ ЛІСТ, ВЫСУНУЎ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН ПА ЛЕСАВЫВАЗЦЫ Ў 27 ТЫС. КБМ. ЗАМЕСТ 22 ТЫС. КБМ. ПАВОДЛЕ ЗАДАНЬНЯ. ВЕСКА ЛЮБАНЬЧЫ НА СВАІМ СХОДЗЕ ВЫСУНУЛА СУСТРЭЧНЫ Ў 2 ТЫС. КБМ., УЗЯЎШЫ НА ГРАМАДЗКІ БУКСІР ВЕСКУ МОХАВІЧЫ. У ВЕСЦЫ КАЗУЛІЧЫ СЯЛЯНЕ АБАВЯЗАЛІСЯ ЗВЫШ ПЛЯНУ ВЫВЕЗЦІ 4 ТЫС. КБМ., ВЫКЛІКАЎШЫ НА САЦСПАБОРНІЦТВА ВЕСКІ СЛАБОДКУ І ФАЦАВУ СЛАБАДУ.

КУЗЕЛІЦКІ І ЛЮБАНЬСКІ СЕЛЬСАВЕТЫ ПЕРШЫМІ Ў РАЁНЕ ЎКЛЮЧЫЛІСЯ Ў ПРАВЯДЗЕНЬНЕ АГУЛЬНА-РАЁННАГА ЧЫРВОНАГА АБОЗУ ПА ВЫВАЗЦЫ ЛЕСАМАТАР'ЯЛУ ДЛЯ ДРЭВААПРАЦОЎЧАГА КАМБІНАТУ. КУЗЕЛІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ ВЫДАЧАЧЫЎ У АБОЗ 300 ФУРМАНАЎ, ЛЮБАНЬСКІ—400.

МАГІДАЎ.

Віцебшчына ўсё яшчэ адстае ў вывазцы

План лесазагатовак па Віцебскім раёне выконваецца нездавальняюча. За студзень загатоўлена дроў 21 проц. квартальнай праграмы, лесаматар'ялаў — 33 проц. Куды горш стаіць справа з вывазкай. Квартальны плян па вывазцы дроў у студзені выкананы усяго на 13 проц., па вывазцы лесаматар'ялаў — на 16 проц.

Прычыны такіх чарапашых тэмпаў крыюцца ў апартуністычнай бязьдзейнасьці раду кіраўнікоў сельсаветаў і калгасаў, у вельмі слабой рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна ў рабоце лесграмгасу.

Прамфінплян на 1932 год да вучастковуй і брыгад не даведзен. Прарабскія і лесаэксплятацыйныя тэхнічныя вучасткі дагэтуль яшчэ не пераведзены на гаспразрачы разрахунак. Адсутнічаюць расцэнкі на пасобныя віды работ. У кіраўніцтве абозам лесграмгасу існуе поўная абязьлічка. Загадчык транспарту адначасова зьяўляецца і загадчыкам гаспадаркі, што не дае магчымасьці наладзіць кантроль за становішчам транспарту. Адміністрацыя лесграмгасу абкружоўваецца толькі пасыпкай паперовых дырэктыў.

Па Віцебскім раёне ў калгасах налічваецца 6.000 коняй. Фактычна-ж у студзені працавала 220 фурманак. У калгасе «Першае мая», Старасельскага сельсавету, з 300 коняй на лесазагатоўках працавалі штодзенна толькі 2-3 коні. Калгас імя Молатава, Бабыніцкага сельсавету, у якім налічваецца 179 коняй, у апошні дэкадзе студзеня зусім спыніў работу. Калгас імя Сталіна за ўвесь час на дзэ ніводнага каня. Ня лепш стаіць справа і з рабочай сілай. З патрэбных штодзенна 500 лесарубаў працуе толькі 130.

Пастанова райкалгасаюзу аб арганізацыі калгасным пастаянных абозаў дагэтуль ня выкананa.

Драўна і з забесьпячэньнем рабочых прадуктамі і прамтаварамі. Беларусаюз даў нарад толькі на адну муку, іншыя тавары і прадукты, якія вызначаны на першы квартал, яшчэ не атрыманы.

Зараз па Віцебску абвешчан месячнік штурму ў мэтах узмацненьня загатовак і вывазкі лесу. Гэрком партыі, сумесна з гэркомам камсамолу і гарсаветам, накіраваў у сельсаветы і лесвучасткі 33 брыгадзіраў. Для лепшага матар'яльна-бытовога абслугоўваньня лесарубаў і вожчыкаў — пасрэдкоп перанінуў сваіх работнікаў непасрэдна на вучасткі. Вызначан спэцыяльны фонд 3.000 руб. для прасьлядкаваньня лепшых ударнікаў.

ЗАРУБЕЖНЫ, 3-ОЎ.

БАЛЬШАВІЦКІ АДПОР ДЭМАБІЛІЗАЦЫЙНЫМ АПАРТУНІСТЫЧНЫМ НАСТРОЯМ

53,6 проц. пляну

Пяцідзёнка з 1 да 5 лютага дала зьніжэньне тэмпаў ільнагатовак: загатоўлена 0,7 процантаў супроць 1,1 процант за папярэднюю пяцідзёнку. Агульнае выкананьне пляну складае 53,6 процантаў, у тым ліку па калгасах МТС — 54 процантаў, іншых калгасах — 75,9 проц. і па адноасобным сэктары—37 проц.

У асобных раёнах, як Талачынскі і інш., культывуецца думка аб нерэаль насьці пляну, аслаблена масава-палітычная работа. На гэтай глебе пракідаюцца дэмабілізацыйныя настроі, якія выкарыстоўваюцца кулакам у падрыўных мэтах.

Узмацніць агонь па дэмабілізацыйных настроях, націскуць на кулацкія, арганізаваць калгасьнікаў і бедняцтва і сярэднякоў—адноасобнікаў на поўнае выкананьне пляну ільнагатовак—такая баявая задача райпартыі, кожнай ячэйкі, сельсавету, калгасу.

Пастулюючы пастановы XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі, мы абязаны ўзмацніць у сьвядомасьці кожнага калгасьніка, кожнага бедняка і сярэдняка—адноасобніка, што ажыцьцяўленьне гэтых гістарычных пастаноў патрабуе ад іх добрасумленнага і поўнага выкананьня сваіх абавязкаў перад дзяржавай.

За дэкаду—43 проц.

СЛУЦАК. (БЕЛТА).

Ленінскі сельсавет і парт'ячэйка, Слуцкага раёну, разгарнулі бальшавіцкую работу па выкананьні пляну ільнагатовак. Была праведзена шырокая масавая работа. Наладжан рогулярны выпуск насьценгазэт. У іх вялікае месца адведзена пытаньню перапрацоўкі і загатовак ільну. Праведзены сходы-нарады. Увесь актыў сельсавету, на чале з парт'ячэйкай, мабілізаваны на фронт ільнагатовак. У выніку за адну дэкаду процант выкананьня пляну ўзьняўся з 36 да 79.

Узорны прыклад у арганізацыі апрацоўкі і здачы ільну дзяржаве паказаў калгас імя Леніна. У калгасе імя Леніна скончыў апрацоўку і замеў 25 ЦЭНТНЭРАЎ ільнаалёна здаў дзяржаве 29 ЦЭНТН. Па перапрацоўцы ільну, як лепшы ўдарнік, вылучыўся наступны калгасьніцы: Ульяна Адліванчык, Люба Скрундзік, Паўлінка Лобан і Фруза Туравец. Гэта брыгада працавала і ў сьвяточныя дні і прыцягнула да работы новых 40 жанчын. Калгас імя Леніна атрымаў премію за перапрацоўку і здачу дзяржаве ільну і заклапаў пераходны сьцяг імя РК КП(б)Б.

Жорстка ўдарыць па разважаньнях аб нерэаль насьці пляну

ТАЛАЧЫН. (Наш спец. кар.).

На 25-га студзеня плян загатовак ільнаалёна па раёне быў выкананы на 40,7 проц., на 1-га лютага — 43 проц., на 5-та лютага — 42,7 проц. Прырост за апошнюю пяцідзёнку ўсяго 0,7 проц.

Раённыя арганізацыі не пераключыліся на баяннюю на барацьбу за хутчэйшую апрацоўку і здачу дзяржаве ільнаалёна. Апрацоўка праходзіць надзвычай марна. Ва многіх калгасах Талачынскага раёну лён ляжыць нават не разасланы. Падобныя факты маюць месца ў Кругляжскім сельсавеце (дзе 40% ільну не разасланa), у калгасе «Перамога» Ляськінскага сельсавету, і інш. У калгасе «Сьцяг працы», Палоцкага сельсавету, ляжыць шмат ільну з галоўкамі, частка якога ўжо згніла.

Адсутнасьць рашучага націску на кулака прывяла да таго, што дзьвярныя заданьні па ільнаалёнае сыгнаны толькі на 15 проц.

Пры агульным недазвальняючым выкананьні пляну ў раённым разрэзе асабліва адстае Паўлаўскі сельсавет, які выканаў плян на 12,5 проц., Валосаўскі — на 39,4 проц. У радзе калгасаў гэтых сельсаветаў пануюць кулацка - рэакцыйныя тэндэнцыі. Так, калгас «Ясная раніца» плян здачы валакна недавыканаў на 6,5 цэнт., ільнаалёнаю разбазарыў, старшыня калгасу Бубарскі, па цяперашнае якога праведзена дзельна ільнаалёнка, разьмеркаваў на «пяцёкі» 3,5 цэнтн. і шмат калгаснікаў на «пяцёкі» патрабы. Калгас «Пяцідзка — за чатыры гады» выканаў плян на 25 проц. Шмат ільну ў гэтым калгасе згнівае, з лепшы разьмеркаван паміж калгасьнікамі.

Райком партыі, райкалгасаюз і іншыя раённыя арганізацыі не правялі належнай работы па самачышчэньні калгасаў ад кулака - варожых элементаў, не мабілізавалі як сялян калгасьнікаў, бедняцкіх і сярэдняцка-адноасобнікаў супроць кулака, супроць рвацка - спакусьнікаў, тэндэнцый за выкананьне абавязкаў перад дзяржавай у першую чаргу.

Замест гэтага ў райкоме БП(б)Б іншых раённых установах цішком і адкрыта культывуецца апартуністычнае разважаньні аб нерэальнасьці пляну. Загадчык арганізацыйнага райкому тав. Гіро заяўляе: «Пляны нерэальныя і аб сустрэчных плянах няма чаго думаць, бо мы і гэтых ня выканаем».

Наколькі беспадстаўны спасылкі на недасеў, на нерэальнасьць пляну, вядзь, з таго, што цэлы рад калгасаў, за якімі лічыцца гэты-ж самы «недасеў», паказалі ўзоры ўдарнай апрацоўкі і поўнага выкананьня пляну ільнагатовак.

Калгас «Ленінскі шлях», Воўчаўскага сельсавету, плошчу ільну на весках райрэгламацыі, «недасеў», і плян загатовак валакна выканан на 100 проц. Тое-ж самае ў калгасах «Шосты зьезд саветаў», «Максім Горкі» і інш.

Беспадстаўнасьць і апартуністычнасьць разважаньняў аб нерэальнасьці пляну, аб недасеве відочныя. Адсюль відочна таксама, што раённы камітэт КП(б)Б павінен з усёй сілай ударыць па людзях, якія сваімі апартуністычнымі разважаньнямі інтэнсуць ўнесьці дэмабілізацыю ў загатоўчую работу і абсьпітуйна спрыяць кулаку ў яго падрыўнай дзейнасьці.

Б. ДАШКЕВІЧ

XVII канфэрэнцыя ВсесКП(б)

ДАКЛАД тав. В. В. КУЙБЫШАВА АБ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДЦЫ

Таварышы! Мы прыступаем да стварэння новай пяцігодкі, новага пляну шырокага сацыялістычнага будаўніцтва. Зусім натуральна, што набудова другога пяцігадовага пляну павінна быць апладнена тым вялікарным вопытам, які накапіла партыя і уся рабочая класа па стварэнні і выкананні першай пяцігодкі.

Тав. Молатаў падводзіў тут папярэднія вынікі першай пяцігодкі. Я вельмі коратка спынюся на асноўных вынках гэй барацьбы, якую праводзіла партыя, рабочая класа і мільённыя масы працоўнага сялянства пры выкананні пяцігодкі.

Агульная задача першага пяцігадовага пляну вызначалася генеральнай лініяй партыі на сацыялістычную індустрыялізацыю нашай краіны. Калі прыняць пад увагу той факт, што ўзровень індустрыяльнага развіцця, на якім знаходзілася наша краіна, калі прыняць пад увагу, што выкананне пяцігадовага пляну і вырашэнне тых сацыяльных задач, якія ставіў перад сабой першы пяцігодны план, супраціўлялася жорсткай клясавай барацьбе з боку ашчадка клясавага ворага як унутры, так і звонку, дык зусім відавочна, што для выканання заданняў пяцігодкі патрэбна была напружанасць усёй энергіі, мабілізацыя запуцінаму шырокіх рабочых і калгасных мас. Прыходзілася браць з бою адну пазіцыю за другой пры распачатым супраціўленні ворагаў: кулак, попман, шкоднік, спробы арганізаваць інтэрвенцыю, капіталістычнае акружэнне, якое ўвесь час заставалося варожым, знаходзілася на сутнасці ў эканамічнай байне з крайнай сацыялізму. Але, наперакор шалёнаму супраціўленню клясавага ворага, мы зладзілі мегай неатвазны шэнгу краіну з аграрна-індустрыяльнай у індустрыяльна-аграрную, дабіўшы радыкальных поспехаў у справе набудовы сацыялізму ў першую пяцігодку. Зусім натуральна, што калі быў зацверджаны першы пяцігадовы план, усе буржуазныя і не прыхільныя рацыяналізацыі яго, як «варварскую утопію» і так-же натуральна, што рабочая класа нашай краіны ня выканаўшы пяцігадовага пляну мабілізавала ўсе свае сілы, выдумула новыя метады і новыя сацыялістычныя формы працы, уступіла ў сацыялістычнае наступленне на лешнія капіталістычныя пазіцыі. Шырока распаўсюдзілася ўдарніцтва, што сведчыць аб вялізарным удзьме энтузіязму рабочых, якія пераляцілі, ня гледзячы на труднасці, ня гледзячы на акружэнне ворагаў, на што-б там ні стала дабіцца выкананьня пляну за чатыры гады. Мінулыя гады былі гадамі правесці сацыялістычнай сыстэмы ў ня спаборнічтве з капіталізмам. Ніягда ніколі ў гісторыі чалавецтва не суспрыкасалося такога рэзкага прошпіставленьня адна адной двюх пройцілеглых арганізацыйных сыстэм.

Якія-ж вынікі? Ужо ня раз характарызавалася ступень і глыбіня падзеньня капіталістычнага сьвету, ахопленага шалёнымі, нябывалым у гісторыі капіталізму крызісам. Таму я ня буду падрабязна спыняцца на характарызаты пы таго, што робіцца ў капіталістычным сьвеце. Дасвіці сказаць, што вытворчасьць да канца 1931 г. за ўсіх краінах упала на дваццаці процантаў; у ПАЗШ, напрыклад, на 43 проц. у параўнаньні з вышэйшым перадкрызісным пунктам. Аб'ём замежна-гандлёвых зносін упаў амаль усюды прыблізна ў два разы з некаторымі адхіленьнямі для асобных краін. Расьце беспрацоўе, якое дасягае вялізарных лічбаў, нябывалых да сотага часу ў жыцьці рабочай класы Амэрыкі і Эўропы. Пагіршаецца жыцьцёвы ўзровень, падае зарплата, салеча, літаральны голад, зруйнаваньне, галочная сьмерць — весь што стала звычайным зьявішчам у краінах капіталізму. Маркс называў эпоху крызісу зваротам да варварства. Гэта дакладна дастасоўна да таго, што зараз робіцца ў цэлым радзе гарадоў Эўропы і Амэрыкі. Вакол гарадоў у шалашох, у зямлянках расьсяляюцца тысячы людзей таму, што яны ня могуць жыць у горадзе, таму, што яны ня могуць матчымасьці заплаціць квартэрную плату. Такавы невясёлыя вынікі апошніх год для капіталізму.

Выкананьне пяцігодкі за чатыры гады

Зусім інакш выглядае справа ў савецкім вынікаў на баку СССР. Цэлер ужо выканчана для ўсіх, што мы ня толькі выканаем пяцігодку, але выканаем яе за чатыры гады. Нагадаю запьвердженьні плян 1932 г. выходзіць з таго, што па важнейшых галінах мы ня толькі цалкам выканаем пяцігодку за чатыры гады, але і перавыканаем яе. Бо на разе калі цяпкай індустрыі мы пяцігодку выканалі за тры гады.

Па калектывізацыі сельскай гаспадаркі мы яе ўжо значна перавыканалі. Аднак, апэрыраць вынікі пяцігодкі трэба па толькі па кольканых паказальніках, якія ўжо даволі аналізаваліся, але і па ступені выкананьня асноўных заданьняў пяцігодкі, асноўнага замыслу першага пяцігадовага пляну. І, калі мы з гэтага пункту погляду падыдзем да вынікаў першай пяцігодкі, якія вырысоўваюцца ў результаце 1931 г., то мы прыдзем да вываду, што асноўны замысел, асноўныя заданьні, якія леглі ў основу лічбовых заданьняў пяцігодкага пляну, таксама перавыкананы намі па ўсіх рашаючых галінах. На самой справе, пяцігодка плянавала значнае пашырэньне пазыцый сацыялізму ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі. Аднак, гэта пашырэньне пазыцый сацыялізму праяўлялася ў значна меншай сярэднім разьмерах, чым мы гэтага дасягнулі. Мы дабіліся абсалютнай перавагі сацыялістычнага сэктару ва ўсёй гаспадарцы, значна перавысілі намечаныя пяцігодкі па калектывізацыі вёскі, ушчынулі ў калгасы звыш 60 проц. усіх батрацка-сераднякіх гаспадарак і тым самым заваявалі ў асноўным калектывізацыю па радзе важнейшых вытваркіх раёнах. Правільная ленінская палітыка мы дабіліся, што бядняк і серадняк у пераважнай масе адвярнуў да сацыялізму. І 1932-33 год прынясе нам завяршэньне ў асноўным калектывізацыі ва ўсім Саюзе. Гэта побач з умацаваньнем асноўнай базы сацыялізму — цяжкай індустрыі азначала ўжо для 1931 г. завяршэньне фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

Мы дабіліся значна большай перавагі на базе сацыялізму, чым гэта меркавоў пяцігадовы план, калі ён зацьвярджаўся У зьездам саветаў і дакладвалася на XVI канферэнцыі нашай партыі. Разгарнуўшы кучаза, дабіўшыся і ў вёсцы перамогі сацыялізму, мы канчаткова вырашым пытаньне «хто каго» за карысьць сацыялізму, супроць капіталізму як у прамысловасьці, так і ў сельскай гаспадарцы. Гэта таксама результат перавыкананьня тых заданьняў, тых агульных установак, таго замыслу, які быў намі прынят для першай пяцігодкі. Пяцігодка пранесвала ператварэньне нашай краіны з аграрна-індустрыяльнай у індустрыяльна-аграрную. Значна перавыконаны заданьні па цяжкай індустрыі, мы ператварэмся ў перадавую індустрыяльную краіну. Мы паставілі ўжо на ногі цяжкую прамысловасьць, стварылі энергетычную і машынабудаўнічую базу для таго, каб рэканструяваць усю народную гаспадарку. Лік рабочых, занятых у дзяржаўнай прамысловасьці, на чыгуначным транспарце і ў будаўніцтве складае ў 1932 г. 11.900 тыс. чалавек. Гэта значна больш таго, што меркавала пяцігодка. Доля ўсёй прамысловасьці рэзка з чыгуначным транспартам і будаўніцтвам у народным даходзе дасягне 57.6 проц., у той час, як на долю сельскай гаспадаркі ледзе 22.9 проц. Такім чынам сацыялістычны сэктар дае больш палову народнага даходу, яраз ілюструючы гатым ператварэньне краіны з аграрна-індустрыяльнай у індустрыяльна-аграрную. Пяцігодка стаяла адной са сваіх задач зацьвярджэньне эканамічнай незалежнасьці краіны, значнае прасоўваньне ў гатым напрамку. План 1932 г. вызначае ў асноўным на базе ўнутранай вытворчасьці, на основе работы нашай значнай сацыялістычнай прамысловасьці.

Пяцігодка ставіла задачай матар'яльнае палепшэньне становішча рабочых. Мы дабіліся і ў гатых адносінах бясспрэчных поспехаў у справе павышэньня матар'яльнага і культурнага ўзроўню працоўных. Ліквідацыя беспрацоўя, чаго мы дабіліся на працягу трох год, тады як плян выходзіў з частковага выкананьня гэтага беспрацоўя і да канца пяцігодкі; 7-мінутнага рабочага дня; палепшэньне бытавога абслугоўваньня мас; вялікае культурнае і жыцьцёвае будаўніцтва, рост бюджэту сацыяльнага страхаваньня, пашырэньне ліку асоб у сем'і, занятых на рабоце, а, значыцца, і рост бюджэту кожнай асобнай сем'і; мерапрыемствы ў галіне ашчадных касаў, у галіне аховы здароўя — усё гэта малое карціну значнага палепшэньня дабрабыту рабочых мас. Рост працоўнасьці працы ў калгасах, вялізарнае пашырэньне посевных плошчаў, рост тавароснасьці сельскай гаспадаркі побач з палепшэньнем культурнага і бытавога абслугоўваньня калгаснікаў даюць карціну росту дабрабыту калгаснай вёскі. Але самае важнае ў гэтых вынках тое, што асновы заміслаў пяцігодкі — стварэньне ўласнай моцнай індустрыяльнай базы, стварэньне магутнай перадавой прамысловасьці, якая здольна пераўзбройць усю народную гаспадарку, — выказана вялікі найбольш поўна. У другую пяцігодку мы ўступаем а буйной прамысловасьцю, набудаванай на найлепшых узорах сусьветнай тэхнікі, мы ўступаем у не даволі ўзброенымі для таго, каб на новай тэхнічай аснове, сваімі рукамі, сваімі машынамі пераўзбройць усе галіны народнай гаспадаркі.

Такі асноўны вынік першай пяцігодкі, які дакажаў усяму сьвету з усёй ясьнасьцю перавагу планавай сыстэмы, перавагу сацыялізму.

Асноўны замысел пяцігодкі ажыцьцёўлен. Ці азначае гэта, што па ўсіх участках заданьні пяцігадовага пляну ў дакладнасьці выкананы? Перш за ўсё, трэба сказаць, што пяцігадовы плян у колькі яго выкананьня абагульняўся. Ён часткова, а часцей даволі значна перабудоўваўся, выгрываліся новыя дадатковыя магчымасьці. Скажам, у галіне металюргіі былі пастаўлены зусім іншыя, далей ідучыя задачы. Хутчэй, чым меркаваў плян, мы ішлі ў галіне калектывізацыі вёскі, у галіне развіцця саўгасаў і ў разуньтаце перапрацоўкі нашу краіну ў краіну самага буйнога ў сьвеце земляробства. Хутчэй мы ішлі ў галіне цяжкай індустрыі, чым меркавала пяцігодка, але затое большыя труднасьці, чым мы чакалі пры складаньні пяцігадовага пляну, мы сустрэлі пры выкананьні заданьняў па якасных паказальніках. Я маю на мэце сабекошт, якасьць прадукцыі, прадукцыйнасьць працы, тэхнічны каэфіцыенты па ўсіх галінах народнай гаспадаркі. З галін алстае разьвіцьцё жывёлагадоўлі, што зьтлумачыцца ня толькі вынікам пікага ўлічэньня, на якім была жывёлагадоўля ў пачатку пяцігодкі, але і тым, што жывёлагадоўля трапіла пад агонь клясавай барацьбы, якая разгарэлася ў вёсцы, і перанесла ад гэтага вельмі сур'ёзныя вельмі значныя страты. Алстаем мы ў галіне транспарту, алстаем у дасягненьнях галінах прамысловасьці, як тэкстыльная прамысловасьць, хімічная і т. д. На труднасьцях выкананьня пляну я і хачу затрымаць вашу ўвагу пекальні больш і асобна зрабіць поўны вынад для пляну другой пяцігодкі. Бо гэтыя труднасьці ўстануць перад намі і ў другой пяцігодцы і іх ва што-б там ні стала проба будзе нашы перамогі.

Які вынік мы маем па сабекошце? Заданьнем пяцігадовага пляну мы тут ня выканалі. Якасьць прадукцыі не палепшаецца такім тэмпам, які прадугледжан пяцігодкай, што прыводзіць да перарасходаваньня матар'ялаў, куткага зношваньня, псаваньня вырабаў і т. д. У галіне тэхнічных каэфіцыентаў па большасьці галін мы не дасягнулі нормаў, якія былі замеранаваны пяцігодкай. Чым ашчадлівасьць такое неныпаньне пляну па якасных паказальніках, тады як у галіне кольканых заданьняў мы ня толькі выканалі, але і значна перавыканалі плян? Перш за ўсё большымі, чым мы разьлічвалі, труднасьцямі аказаньня новай тэхнікі. Прыклад пуску цэлага ряду заводаў, «пускавых гарадоў» зьтлумачыць яркай ілюстрацыяй таго, якія вялікія труднасьці стаць у справе асваеньня новай тэхнікі, перад якімі мы аказаліся нецаклі узброенымі. Па-другое, гэта тлумачыцца адставаньнем у справе падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў, што мае вялізарнае значэньне і для якасьці прадукцыі і для дасягненьня заданьняў па сабекошце, па прадукцыйнасьці працы, па арганізацыі працы наогул. І, нарэшце, што самае важнае з усіх прычын недасягненьня пляну па якасных паказальніках, гэта недахопы арганізацыі працы, урэгулявання, абязьпячэньня, недавой энергічная барацьба з ляжучаньцю рабочай сілы і г. д. і г. д. Калі дасягненьня кольканых заданьняў можна было дабіцца, ня глядзячы на гэтыя труднасьці, то для дасягненьня якасьці работы нашы недахопы аказаліся настолькі моцнымі, што мы іх перамагчы ў першым пяцігодцы поўнасьцю не змаглі.

